творчасці, але і для ўсёй беларускай літаратуры. Гэта найперш яскрава выяўленая «заземленасць» яе, абумоўленая грамадска-сацыяльнымі праблемамі нацыянальнага развіцця. І ўсё ж у сваёй асабістай творчай біяграфіі М. Танк да канца жыцця арыентаваўся на творчы пошук і эксперымент. Яго любімай паэтычнай формай заўсёды заставаўся свабодны верш – верлібр, а паэтыка шматлікіх паэтычных кніг захапляе шырынёй мастацкіх вобразаў і глыбінёй асацыяцый і неардынарнасцю светаўспрымання. Танкаўскі верлібр і верлібры іншых беларускіх паэтаў XX – пачатку XXI ст. (В. Ластоўскага, А. Наўроцкага, А. Разанава, А. Вярцінскага, У. Арлова) з’яўляюцца мастацкай формай, у якой суб’ект паэтычнага выказвання імкнецца гарманізаваць свет на ментальна-нацыянальнай аснове. Акцэнт у падобнага плана творах робіцца на вобразах з падкрэсленымі нацыянальна-культурнымі канатацыямі, якія выступаюць галоўным, неадменным кампанентам жанравай структуры. У гэтым ракурсе можна гаварыць пра існаванне танкаўскай традыцыі ў сучасным беларускім літаратурным дыскурсе.

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Гарадніцкі, Я. Мастацкі свет літаратурнага твора як катэгорыя паэтыкі : аўтарэф. дыс. … д-ра. філал. навук / Я. Гарадніцкі. – Мінск, 2016. – 48 с.
2. Танк, М. Зб. тв. : у 4 т. Т. 4 : вершы, дзённікі, пераклады / М. Танк. – Мінск : Беларусь, 1967. – 700 с.
3. Танк, М. Зб. тв. : у 6 т. Т. 6 : дзённікі, літаратурна-крытычныя артыкулы / М. Танк. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1981. – 637 с.
4. Kiњlak, E. Walka Jakuba z anioiem: Czesiaw Miiosz wobec romantycznoњci / E. Kiњlak. – Warszawa : Prószyński i S-ka, 2000. – 360 s.
5. Tank, M. Kartki kalendarza. Z biaior. przei. Stefan Atlas ; wstкp i przypisy Floriana Nieuwaïnego / M. Tank. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1977. – 385 s .

**Аляксандр Цікоцкі**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(г. Мінск, Беларусь)*

# РАСКРЫЦЦЁ АСОБЫ СУРАЗМОЎЦЫ Ў ІНТЭРВ’Ю ПАРТРЭТНАГА ТЫПУ

Разглядаюцца стылістычныя прыёмы ў раскрыцці асобы суразмоўцы, якія выкарыстоўваюцца журналістамі ў інтэрв’ю партрэтнага тыпу.

*Ключавыя словы:* стыль інтэрв’ю; партрэтнае інтэрв’ю; загаловак; падзагаловак; імя суразмоўцы.

Жанравая палітра сучасных медыя характарызуецца значнай разнастайнасцю. Але пры гэтым, як адзначаюць многія, відавочная перавага аддаецца інфармацыйным жанрам. Інфармацыя цікавіць многіх аўтараў (як і чытачоў) больш за аналітыку. У сваю чаргу, сярод інфармацыйных жанраў даволі значнае месца займае інтэрв'ю.

Сучасныя даследчыкі даюць розныя класіфікацыі інтэрв'ю. Часцей за ўсё вылучаюць інфармацыйнае інтэрв'ю, інтэрв'ю-замалёўку і партрэтнае інтэрв'ю. Калі ў першых двух у цэнтры ўвагі знаходзяцца пэўныя грамадскі важныя, актуальныя ці проста цікавыя для чытачоў пытанні, то ў трэцім галоўнае – сама асоба інтэрв'юіруемага, яго жыццёвы шлях, характар, захапленні і г. д. Прыкладам інтэрв'ю першага тыпу можа служыць публікацыя «Таямніцы Друцкага кургана. Назіраем за логікай археалагічнага даследавання» (Звязда. 11.10.2018), у якой аўтар гутарыць з загадчыцай цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вольгай Ляўко аб тым, як удалося адшукаць астанкі прапраўнука князя Усяслава Чарадзея. Апісваюцца падрабязнасці археалагічных раскопак, іх этапы, але нічога не гаворыцца пра саму В. Ляўко.

Часам, праўда, з такіх інтэрв'ю можна даведацца пра пункт гледжання суразмоўцы па сутнасці абмяркоўваемых пытанняў. Так, у інтэрв'ю з У. Абрамавым, дырэктарам Мясцовага фонду ўстойлівага развіцця «Афлатус», які ставіць мэту развіваць прадпрымальніцтва ў малых гарадах і сельскай мясцовасці і пачаў сваю дзейнасць з вёскі Вішнева Смаргонскага раёна (Звязда. 11.06.2015), спачатку гаворка ідзе пра бягучую дзейнасць фонду ў гэтай вёсцы, праблемах, якія пры гэтым узнікаюць. Але прыкладна ў сярэдзіне інтэрв'ю журналіст паварочвае яго ход ў іншы бок. Ён задае пытанне: *Давайце зараз наогул пагутарым пра бізнес у рэгіёнах – як там сёння жывуць прадпрымальнікі?* Тым самым ён прапануе суразмоўцу зрабіць абагульненні, падзяліцца сваімі думкамі на гэты конт, што той і робіць. Але якіх-небудзь звестак пра асобу суразмоўцы, яго жыццёвыя погляды і г. д. мы тут не знаходзім, ды аўтар і не ставіць перад сабой такой задачы.

Зусім іншы характар маюць партрэтныя інтэрв'ю. Тут у цэнтры ўвагі – асоба суразмоўцы, яго жыццё, светапогляд, характар, звычкі. Раскрыць іх дапамагаюць умела пастаўленыя пытанні. У некаторых выпадках гэта можа быць нават не прамое пытанне, а пэўнае сцвярджэнне, меркаванне. Гэта знаходзім, напрыклад, у інтэрв'ю, узятым у маладой мінчанкі, маці трох сыноў. *Кажуць, што матулі, у якіх адны сыны – асаблівыя, – гаворыць журналіст. Нешта ў гэтым ёсць. Я вельмі радая,*

*што ў мяне тры хлопчыкі. Ужо разумею ўсю цяжкасць выхавання. Але думаю, Бог пакуль дзяўчынку не дае, таму што ў мяне характар прамалінейны. Хлопцам як скажаш, так яны і разумеюць. Дзяўчаткі, напэўна, патрабуюць далікатнасці, схільныя надумваць. Адказнасць – вельмі важная якасць для мужчын. У сваіх хлопцаў мы яе развіваем з маленства: вучым прасіць прабачэння. Правініўся і адчуваеш гэта – даводзь сітуацыю да лагічнага завяршэння. Трымаеце сыноў у строгасці і дысцыпліне? – пытаецца інтэрв'юер. Хутчэй наадварот. Мы ім поўнасцю давяраем, таму даём поўную свабоду. Узялі малаток ці адвёртку – добра. Дапамаглі дранікі смажыць ці цеста замешваць – добра. Мыюць падлогу – добра* (Звязда. 11.10.2018). Так паступова, фраза за фразай раскрываецца асоба суразмоўцы, яго характар.

Нярэдка асоба суразмоўцы пачынае раскрывацца ўжо ў загалоўку (загаловачным комплексе). Маюцца на ўвазе вельмі распаўсюджаныя ў сучасных газетных інтэрв'ю загалоўкі, якія складаюцца з імя і прозвішча героя і яго характэрнага, ключавога выказвання. Такія загалоўкі звычайна маюць падзагаловак, змест якога атрымлівае далейшае развіццё ва ўступе да інтэрв'ю, а потым – у асноўным тэксце. Вось прыклады:

*Герман Цітоў: няўдачы для мяне – прыступкі для росту»* (загаловак). *Яго творчы шлях пачаўся з удзелу ў хоры, а цяпер ён вядомы спявак, тэлевядучы і аўтар шматлікіх хітоў розных эстрадных выканаўцаў* (падзагаловак) (Чырвонка. 04.10.2018); *Анастасія Калашнікава: "Біць прыгожа мяшок? На гэта здольныя многія…* (загаловак). *Як чэмпіёнка краіны па кікбоксінгу і муай-тай працуе на "хуткай" і займаецца кіналогіяй* (падзагаловак) (Звязда. 02.10.2018). *Уладзімір Карачэўскі: «Мне прыходзіцца быць рэфарматарам»* (загаловак). *Больш за паўгады таму Уладзімір Карачэўскі пакінуў месца дырэктара Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, дзе дасягнуў заўважных поспехаў, і прыйшоў на пасаду дырэктара кінастудыі «Беларусьфільм»* (падзагаловак) (29.09.2018).

Часам імя суразмоўцы-героя інтэрв'ю называецца толькі ў падзагалоўку ці нават у тэксце: *Калі вучань спрачаецца – гэта супер!* (загаловак). *Малады педагог – пра сакрэты, выхаваўчую сілу гісторыі і крытычнае мысленне* (падзагаловак). *«За 6 мільёнаў, – кажа адзін голас – не мудраца, не паэта – звычайнай дзяўчынкі»… Гэтыя словы пісьменніка Ільі Эрэнбурга, прысвечаныя «Дзённіку Ганны Франк», сталі эпіграфам да ўрока па сусветнай гісторыі ў 10 класе сталічнай гімназіі № 34. Што паспрыяла прыходу ў Германіі нацыстаў да ўлады?*

*Што адбывалася падчас «Хрустальнай ночы»? Вучні шукаюць адказы на гэтыя пытанні пад кіраўніцтвам сваёй маладой настаўніцы Дар'і Алегаўны Касяковай* (Звязда. 06.10.2018). Далейшае раскрыццё асобы суразмоўцы адбываецца праз выказванні педагога, яго разважанні: *Які́м павінен быць урок, каб ён прынёс задавальненне і настаўніку, і вучню? Па-першае, дынамічным, каб ні педагогу, ні дзецям не было сумна. Калі 45 хвілін праляцелі як адно імгненне – гэта для мяне вельмі важны паказчык, – разважае Дар'я Алегаўна… Для мяне таксама вельмі важна паказаць сувязь гісторыі, якую мы вывучаем, з сённяшнім днём. Нават калі не атрымліваецца знайсці прамую сувязь з сабой, можна паспрабаваць уявіць сябе чалавекам той эпохі, які знаходзіцца ў канкрэтных умовах* (Звязда. 06.10.2018). Яшчэ прыклады: *Калі думаю пра медалі, ахілы рвуцца. Што перашкаджае нашым гімнастам перамагаць? Чэмпіён Еўропы расказвае пра старыя залы і сур'ёзныя траўмы* (Звязда. 06.10.2018); *Яго дэвіз – толькі наперад. Ім малады футбаліст кіруецца не толькі на полі. Павел Кляннё дзевятнаццацігадовы нападаючы прафесійнага футбольнага клуба «Тарпеда Мінск», аўтар выдатных галоў, прынесеных у скарбонку перамог каманды. Спакойны і разважлівы ў жыцці, актыўны і энергічны на полі. Чым жа ён вылучаецца сярод іншых?* (Чырвонка. 04.10.2018).

Такім чынам, менавіта партрэтнае інтэрв'ю служыць для стварэння партрэта суразмоўцы, раскрыцця яго асобы, характару, поглядаў.

**Лілія Шасцярнёва**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(г. Мінск, Беларусь)*

## КАНЦЭПТ «КАХАННЕ» Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАРЭМІЯЛОГІІ

Артыкул прысвечаны даследаванню канцэпту «каханне» ў беларускай парэміялагічнай карціне свету. Звяртаецца ўвага на тое, што канцэпт «каханне» ў беларускай лінгвакультуры цесна звязаны з паняццямі сям'я і шлюб і падкрэслівае думку аб тым, што сям'я – гэта асноўная жыццёвая каштоўнасць чалавека.

*Ключавыя словы:* парэміялогія; канцэпт «каханне»; ментальнасць народа; сямейныя каштоўнасці.

Каханне займае важнае месца ў жыцці кожнага чалавека і вызначае яго стаўленне да свету. Агульнавядома, што ў аснове розных культур